# СТАРАННЫ СКРЭПЕРЫСТ

Раўнамерна працуе рухавік скрэпернай лябёдкі. Рухі ў машыніста скрэпера амаль аднолькавыя — уперад, назад рычагамі —і коўш, паслухмяны волі і ўменню шахцёра, слізгае па горнай выпрацоўцы да камбайна пусты, ад камбайна, запоўнены рудой, — на транспарцёр, дзе высыпае руду і пусты зноў працягвае свой ранейшы шлях.

Але вось чуецца амаль няўлоўны трэск і машыніст скрэпера выключыў лябёдку.

— Парвалася тармазная стужка, —заключае ён і пачынае хутка працаваць гаечным ключом. Праз хвілін дзесяць пастаўлена новая тармазная стужка, якая была ў запасе, і лябёдка зноў запрацавала.

У машыніста скрэпера майстэрства знешне непрыкметнае, але і тут ёсць майстры сваёй справы. Адзін з іх, Міхаіл Рускевіч—член перадавой брыгады на рудніку Першага калійнага, якой кіруе К. Давыдок. Больш чатырох гадоў стаіць Міхаіл за рычагамі скрэпернай лябёдкі, і заўсёды аб яго рабоце і члены брыгады, і кіраўніцтва ўчастка адклікаюцца з пахвалой. Ён сам ліквідуе паломку, як было ў выпадку з тармазной стужкай, не чакаючы слесара. Коўш у яго, як гавораць шахцёры,«не ганяе паветра па выпрацоўцы», заўсёды загружан рудой. У яго пад рукамі заўсёды спраўны інструмент, запасныя тармазныя стужкі. Падышоўшы да лябёдкі, заўважаеш, што тут працуе старанны скрэперыст —навокал выкідана руда і падмецена, не ўбачыш абрыўкаў троса. За ўвесь час Міхаіл не мае заўваг па парушэнню правіл тэхнікі бяспекі і працоўнай дысцыпліны. Міхаіл—чалавек,як кажуць, без сучка і задорынкі. За тое, што ён не праходзіць міма недахопаў, за старанную працу, выбралі яго членам рэдкалегіі насценнай газеты ўчастка.

А калі Міхаіла запытаеш, чаму ён не пераходзіць працаваць на камбайн, то ён адказвае: «Люблю я гэтую спецыяльнасць і мяняць яе не буду».

**Э. ГОЦКІ,**
**горны майстар.**